# «ЦЯЖКІЯ ДАРОГІ ЖЫЦЦЯ» МІКАЛАЯ ЧАРГІНЦА

**Народны пісьменнік Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ прэзентаваў свае мемуары ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэта чатыры кнігі з цыкла аўтабіяграфічных раманаў «Цяжкія дарогі жыцця», у якіх аўтар дзеліцца сваім багатым жыццёвым досведам. Тут і дзіцячыя ўспаміны аб Вялікай Айчыннай вайне, і спартыўная кар'ера, і работа ў органах унутраных спраў, і афганскі перыяд.**



— Кнігі напісаны як аўтабіяграфічны раман. Але чытаюцца займальна, як трылер ці дэтэктыў. Там цудоўна выбудаваны дыялогі, сцэны. Яны вельмі кінематаграфічныя, — так падчас прэзентацыі падзяліўся сваімі ўражаннямі ад «Цяжкіх дарог жыцця» **дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Іван САВЕРЧАНКА,** — Мы ведаем розныя навуковыя працы, нейкія акадэмічныя выданні. Але калі чытаеш гэту кнігу, ты літаральна «ўваходзіш» у тую атмасферу. Талент пісьменніка выдатна перадае той час, пачуцці людзей, іх чаканні, іх памкненні і страхі.

Сам жа Мікалай Іванавіч на мерапрыемстве заявіў, што цвёрда перакананы ў тым, што абавязак кожнага пісьменніка, які бачыў на свае вочы Вялікую Айчынную вайну, расказаць пра гэта. Уяўна вяртацца ў некаторыя эпізоды жыцця — вельмі цяжка.

— Прыходзіцца часам ледзь не са слязьмі, успамінаючы, пісаць, — прызнаецца аўтар.

Мікалай Чаргінец не толькі таленавіты пісьменнік, але і палітык, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, ганаровы грамадзянін Мінска, уладальнік міжнародных прэмій, дзяржаўных узнагарод. Яго чытаюць па ўсім свеце, агульны тыраж выдадзеных твораў складае больш за сем мільёнаў экзэмпляраў.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Вадзіма ГІГІНА,** Мікалай Чаргінец — яскравы прыклад паспяховага беларускага чалавека.

— Таленавіты, прыгожы, сябраваў з маці Юрыя Гагарына і ўсёй яго сям'ёй, некалькі жыццяў пражыў, — распавядае Вадзім Гігін. — Пасля вайны з футбольнай камандай трапіў у паўразбураны яшчэ Пхеньян, бачыў Кім Ір Сена — у той час, у 1950-я гады, гэта было як на іншую планету трапіць. Пасля перайшоў на працу ў крымінальны вышук, тройчы датэрмінова прысвойвалася яму званне. Гэта менавіта той міліцыянер, які першым прыехаў на месца трагічнай гібелі Пятра Міронавіча Машэрава. І я асабіста ад «афганцаў» чуў гісторыі пра Чаргінца, у тым ліку пра тое, як ён людзям выратаваў жыццё.

Працяг абавязкова будзе. Ужо сёлета новая частка мемуараў выйдзе ў свет. Мікалай Чаргінец прыадчыніў заслону таямніцы і падзяліўся тым, што чакае чытачоў у новай кнізе:

— У ёй я пішу пра перыяд развалу Савецкага Саюза: цяжкі час, найбяднейшы стан краіны, развал эканомікі, людзі на вуліцах абураюцца, патрабуючы заробку і працы, заводы стаяць... Тады мы і пазнаёміліся з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Я на той момант не верыў, што малады хлопец з вёскі зможа дапамагчы беларусам. Я памыліўся. З яго энергіяй і выключным талентам удалося гэта зрабіць. І я буду пра гэта пісаць.

Падчас мерапрыемства ўсе госці маглі задаць любое пытанне пісьменніку (нават самае правакацыйнае) і атрымаць аўтограф. Больш за тое, кожны ахвотны мог азнаёміцца з тэматычнай выставай, у якой сабраны матэрыялы з фондаў бібліятэкі аб жыццёвым і творчым шляху Мікалая Чаргінца, таксама там былі рэдкія экзэмпляры кніг з асабістага архіва аўтара.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**